Стрэльчанка П.С.,студ. гр. 320н ФТБКіСМ БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гуткоўская С.В., канд. філал. наук, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АСАБЛІВАСЦІ ТАНЦАВАЛЬНАГА ФАЛЬКЛОРУ ПАНЯМОННЯ

Гісторыка-этнаграфічны рэгіён – рэгіён, які вылучаецца на пэўнай тэрыторыі паводле комплексу этнакультурных прыкмет: асаблівасцей этнічнай гісторыі, характару прылад працы, народнай архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйнага адзення, фальклору, мясцовых гаворак [2, с. 153].

Панямонне з’яўляецца цікавым рэгіёнам Беларусі, паколькі мае багатую фальклорную спадчыну. Фальклор уяуляе сабой мастацкую калектыўную творчую дзейнасць працоўнага народа, якая адлюстроўвае яго жыццё, погляды, ідэі. У склад фальклора ўваходзяць вусная паэтычная творчасць, музыка, тэатр, танец, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, што створаны народам і бытуюць у народных массах [2, с. 508].

Разглядаючы фальклор больш падрабязна, можна выдзяліць нацыянальны фальклор, які з'яўляецца вынікам трансфармацыі ранніх фальклорных форм. Ён вызначаецца нацыянальным мастацкім усведамленнем і асаблівасцямі светаўспрымання канкрэтнага народа, умовамі жыцця і нацыянальнай гісторыяй.

Для таго, каб вызначыць асаблівасці пэўнага рэгіена, звернемся да паняцця “абласны фальклор”. У слоўніку навуковай і народнай тэрміналогіі “Усходне-славянскі фальклор” даецца наступнае азначэнне абласнога фальклору: “фальклор вобласці, рэгіёна, які адрозніваецца ў той ці іншай ступені ад фальклора ўсяго дадзенага этнічнага ці агульнанацыянальнага масіва ” [ 3, с. 392 ].

Мэта артыкула – выявіць спецыфічныя асаблівасці танцавальнага фальклору рэгіёна Панямоння.

Рэгіён славіцца сваёй самабытнасцю, мастацкай дзейнасцю народа, творчымі дасягненнямі. Багатая гісторыя Панямоння адклала след на гісторыі Беларусі. На тэрыторыі гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна жылі і працавалі айчынныя і замежныя дзеячы культуры і мастацтва. Такая цікавая гісторыя не можа не прываблiваць.

Панямонне, гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае тэрыторыю Гродзенскай вобласці і сумежных частак Брэсцкай і Мінскай абласцей. Насельніцтва этнагенетычна склалася на славянскай аснове з удзелам асіміляваных літоўцаў (старажытнай Літвы і аўкштайтаў), ятвягаў, прусаў, татараў і іншых народаў. У Сярэднявечча рэгіён быў вядомы пад назвай Літва, адначасова з якой ужывалася і другая назва – Чорная Русь, якая сустракаецца у крыніцах з XV стагоддзя і ўзнікла як антытэза назве “Белая Русь”.

У канцы X — першай палове XI стагоддзя гэты рэгіён далучаны да Кіеускай Русі, а ў XII - першай палове XIII стагоддзя знаходзіўся ў сферы ўплыву галіцка-валынскіх і польскіх князёў. У XIII стагоддзі рэгіён апынуўся ў цэнтры важных палітычных падзей, якія аказалі непасрэдны ўплыў на ўтварэнне ВКЛ, Рускага і Жамойцкага княстваў. У гэты час этнічны склад насельніцтва рэгіёна папоўніуся за кошт вялікай хвалі перасяленцаў з Мазовіі, Прусіі і Жэмайціі, а таксама мігрантамі з паўднева-рускіх зямель. Край станавіўся адным з самых населеных і багатых абласцей Старажытнай Русі. Адбылася натуральная асіміляцыя танцавальнага фальклору Панямоння з фальклорам суседніх краін, што з’явілася прычынай яго адрознівання ад другіх рэгіёнаў Беларусі.

У выніку этнічнага сімбіёзу на славянскай аснове складваецца рэгіянальны тып культуры, у якой спалучаліся заходнярускія ( беларускія ), польскія і балцкія рысы [2, с. 386-387].

Па матэрыялах Галіновай навукова-даследчай лабараторыі ў Гродзенскай вобласці зафіксавана 27 узораў карагодаў , 44 традыцыйных танцаў , 43 полькі з назвамі , 59 гарадскіх бытавых танцаў, 48 гульняў , 19



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадаў , у якіх выкаростоўваліся харэаграфічныя элементы. [ 1 ].

У адрозненні ад іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, Панямонне мае блізкасць да абразцоў польскіх танцаў, гэта пацвярджаецца музыкай, якая суправаджала іх выкананне. Напрыклад, вельмі папулярнымі з’яўляліся мелодыі "Кракавяка" і "Абэрка", якія запісаны ў фальклорных экспедыцыях Нацыянальнай Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. У танцы "Засеялі гуралі" захавалася нават польскае гучанне прыпеўкі: "Засеялі гуралі жытка, жытка ад конца до конца пшыстко, пшыстко". Танцы, якія трапілі ў Беларусь, у асноўным захавалі свой нацыянальны воблік. Яскравым прыкладам можа стаць фальклорны ўзор " Абэрак", які запісаны ў вёсцы Леановічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Для яго характэрны наступныя асаблівасці: нахіленне корпуса, вярчэнні, абяганне дзяўчынай хлопца, які сядзеў у калене.

У вёсцы Драпаўцы Зельвенскага раёна зафіксаваны цікавы танец пад назвай "Легіён". У якім разам з венгерскім "ключом" і прыпеўкай: "Антэк мае легінера, рым, цым, цым" дайшло да нас з-за мяжы бразганне і звон жалезных шпораў [ 4, с. 320 ]. На сённяшні дзень многія з гэтых элементаў харэаграфіі захаваліся і шырока выкарыстоўваюцца балетмайстрамі пры стварэнні сцэнічных кампазіцый. Вельмі прыгожым з’уляецца гарадскі-бытавы танец “Дырыжабль” , які запісаны ў Гродзенскай вобласці. У гэтым танцы дзве лініі хлопцаў і дзяўчын выцягвалі рукі ў бок па другой пазіцыі і адначасова паварочвалі іх разам з корпусам то ўправа, то ўлева,- яны паказвалі момант запуска дырыжабля [ 4, с. 305].

Пад час сваіх экспедыцый студэнты і выкладчыкі кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр культуры і народнай творчасці сабралі фальклорны матэрыял у тым ліку ўзоры, запісаныя ў Панямонні. Творы, якія дайшлі да нас без назваў, можна знайсці ў архіве лабараторыі. Доктар мастацтвазнаўства Юлія Міхайлаўна Чурко была ўдзельнікам гэтых экспедыцый напрацягу дзесяцігоддзяў. У манаграфіі “Беларускі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

харэаграфічны фальклор” запісаны матэрыял заходне-усходняга рэгіёна Беларусі.

Такім чынам, ў танцах рэгіёна прысутнічаюць характэрныя рухі іншых краін, якія сталі для нас нацыянальнымі: Польша пакінула нам пахіліванне корпуса, вярчэнні, абяганне вакол хлопца, танцавальны “ключ ”, бразганне шпорамі захавалася ад Венгрыі, лёгкасць, прыжкі рэгіён увабраў ад Балцкіх краін, цікавыя палажэнні рук ад Расіі.

Па вынікам фальклорных экспедыцый, гісторыка-этнаграфічны рэгіён захаваў вялікую колькасць танцавальных ўзораў, якія вылучаюцца арыгінальнасцю і непаўторнасцю.

Спіс выкарыставанай літаратуры:

1. Архив Отраслевой научно – исследовательской лаборатории белорусского танцевального творчества БГУКИ

2. Этнаграфія Беларусі: Беларуская савецкая энцыклапедыя. / гал.рэдактар І.П. Шамякін – Мн.:БелСЭ, 1989 – 575с.

3. Восточно славянский фольклор: слов. научн. и нар. терминологии / отв. ред. К.П. Кабышников – Мн.: Навука і тэхніка, 1993 – 478с

4. Чурко, Ю.М. Беларускі харэаграфічны фальклор / Ю.М. Чурко– Мн.: Выш.шк., 1990-415с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ